ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б) БЕЛАРУСІ І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 25 (45) Панядзелак 25 Чэрвеня 1945 г.

## ЗАКОНЧЫЦЬ СЕНАКАШЭННЕ ДА ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ

Пачынаецца касьба—адна з важнейшых сельскагаспадарчых кампаній. Успешна правесці уборку сена—гэта значыць забяспечыць пагалоўе ската высокаякаснымі кармамі, а ад гэтага залежыць далейшае развіццё жывёлагадоўлі. Саўнарком БССР і ЦК КП(б)Б лічаць, што забяспячэнне жывёлы высокаякаснымі кармамі з'яўляецца асноўнай задачай партыйных, совецкіх і зямельных органаў і прынялі шэраг мерапрыемстваў для хутчэйшага правядзення сенакашэння, своечасова папярэдзілі мясцовыя арганізацыі аб неабходнасці своечасовай падрыхтоўкі да сенауборкі, каб да ўборкі ўраджаю закончыць сенакашэнне.

Задача заключаецца у тым, каб выканаць план сенакашэння і убраць сена ў ранція тэрміны. Сена, убранае своечасова, мае бялкоў у два разы больш, чым у познюю ўборку. Пагэтаму неабходна разварнуць шырокую масава-растлумачальную работу сярод сялян за своечасовае правядзенне сенакашэння і ўборкі сена. У бліжэйшыя дні закончыць падрыхтоўку да сенауборкі, закончыць рамонт сенауборачнага інвентара, неабходна, каб нашы кузні і майстэрні МТС працавалі бесперабойна. Старшыні сельскіх советаў і старшыні зямельных камісій павінны ў бліжэйшыя дні надзяліць сялян сенакосам, раздаць усе маючыяся госфондаўскія сенакосныя угоддзі. Неабходна арганізаваць социялістычнае спаборніцтва сярод сялян за своечасовую і высокаякасную уборку сенакосных угоддзяў, за стварэнне дастатковай колькасці кармоў для жывёлы і за датэрміновае выкананне плана сенапастаўак дзяржаве

## СЕЛЬСКІ АГІТАТАР

Натхнёныя пабедай Чырвонай Арміі сяляне раёна прыкладаюць усе сілы, каб хутчэй аднавіць разрушаную гаспадарку.

Поспех у рабоце залежыць ад таго, як будзе пастаўлена палітмасавая работа на вёсцы. Загэтым неабходна ўмацаваць сельскія агіткалектывы, узмацніць практычную дапамогу ім.

Агітатар на вёсцы павінен быць правадніком бальшэвіцкага слова; арганізатарам соцыялістычнага спаборніцтва паміж вёскамі, асобнымі сялянамі.

Каб паспехова вясці палітмасавую работу, агітатар павінен б ы ц ь асведамлён на ўсіх палітычных пытаннях, рэгулярна чытаць газеты, глыбока вывучаць усе праісходзячыя падзеі.

Кіраўнікі агіткалектываў абавязаны рэгулярна праводзіць нарады агітатараў, на якіх а г і т а т а р ы павінны падзяліцца в о п ы т а м работы, слухаць інструктыўныя даклады, інфармацыі аб міжнародных падзеях і вывучаць важнейшыя рашэнні партыі і ўрада.

Аднак, асобныя кіраўнікі агіткалектываў не ўдзяляюць належнай увагі выхаванню агітатараў.

Кіраўнікі агіткалектываў Яглевіцкага—тав. Верашчагін Падстарынскага—тав. Дзіковіч, Сенькавіцкага—тав. Серова не кіруюць агіткалектывамі, рэдка бываюць у гэтых сельсоветах, не праводзяць з агітатарамі інструктыўных семінараў, не вучаць іх і самі не выступаюць з дакладамі. Агітатары не атрымліваюць належнай дапамогі ў сваёй рабоце.

Вялікую дапамогу агітатарам могуць і павінны аказваць хаты-чытальні ў справе забеспячэння агітатараў літаратурай і справачнымі матэрыяламі. Доўг сельскага агітатара—асабістым працоўным п р ы к л а д а м і бальшэвіцкім словам мабілізаваць ўсіх сялян на выкананне прадстаячых задач.

## Раўняйцеся па перадавым

Слясарная і шавецкая майстэрні райпромкамбіната з'яўляюцца перадавымі. Шавецкая майстэрня (загадчык т. Мароз) выканала план за май месяц на 220 проц.

Асабліва добрыя вынікі ў працы паказаў майстар т. Чэшун, які штодзённа выконвае норму на 180—200 проц.

Добра працуюць работнікі слясарнай майстэрні. Майстар т. Дылько выконвае норму на 150 проц. вучань Жукоўскі—на 130 проц.

Гэта—перадавыя рабочыя райпромкамбіната.

## Зводка

аб ходзе пад'ёма папараў на 20. 6. 1945 г.

| Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|
| 1. Альшавіцкі | 127,5 |
| 2. Белавіцкі | 100,1 |
| 3. Падстарынскі | 100 |
| 4. Стайкаўскі | 75,2 |
| 5. Любішчыцкі | 75 |
| 6. Яблонскі | 72 |
| 7. Альбінскі | 70,2 |
| 8. Яглевіцкі | 70, |
| 9. Грыўдзенскі | 68.3 |
| 10. Сенькавіцкі | 64,4 |
| 11. Гошчаўскі | 60,9 |
| 12. Бусяжскі | 60 |
| 13. Косаўскі | 26,3 |
| 14. Івацэвіцкі | 17 |
| 15. Жытлінскі | 2 |
| УСЯГО ПА Р-НУ: | 71,4 |

# ДАСТОЙНА СУСТРЭНЕМ УСЕНАРОДНАЕ СВЯТА

Трэцяга ліпеня споўніцца гадавіна з дня вызвалення сталіцы Беларусі горада Мінска. Гэты дзень зараз будзе ўсенародным нацыянальным святам, адзначаючым гістарычную падзею—вызваленне беларускага народа ад нямецка—фашысцкіх захопнікаў.

Беларускі народ пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі, ў цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны сваёй самаадданай барацьбой супроць нямецка—фашысцкіх захопнікаў заваяваў сабе права лічыцца гераічным народам і з'яўляецца адным з перадавых атрадаў у складзе Вялікага Совецкага Саюза.

У чорныя гады нямецкай акупацыі беларускі народ паказаў высокае маральнае, палітычнае адзінства, сваю згуртаванасць вакол Совецкага Урада, вакол партыі большэвікоў і любімага правадыра народаў таварыша СТАЛІНА. Рабочыя, інтэлігенцыя і працоўныя сяляне Косаўскага раёна прыкладвалі вялікія намаганні ў справе барацьбы супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З'явіўшыся ў партызанскія атрады, перадавыя людзі нашага раёна выканалі гістарычныя ўказанні таварыша СТАЛІНА: стварылі невыносімыя ўмовы акупантам, і не адна тысяча наглых захопнікаў знайшла сабе магілу на тэрыторыі нашага раёна.

Слаўных камандзіраў і камісараў, арганізатараў партызанскай барацьбы, дзейнічаючых на тэрыторыі нашага раёна, такіх, як камандзіры партызанскіх атрадаў таварышы Чаркоў. Алексей Міхайлавіч, Севькін Уладзімір Нікалаевіч, камісары партызанскіх атрадаў таварышы Егараў і Талочка і радавых партызан, комсамольцаў Нікалая Гойшыка, Юрашчыка Міхаіла, якія беспашчадна грамілі акупантаў, наводзілі страх ворагам і гераічна палі ў барацьбе за нашу любімую Радзіму, працоўныя нашага раёна не забудуць ніколі, і памяць аб іх захаваюць на доўгія гады, як аб слаўных патрыётах нашай непабедзімай соцыялістычнай Радзімы.

Працоўныя раёна пасля вызвалення Чырвонай Арміяй прыкладалі ўсе намаганні на ўзмацненне дапамогі гераічнай Чырвонай Арміі ў справе канчатковага разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Працоўныя раёна прарабілі агромную работу па аднаўленню жалезных, шасейных дарог і прамысловых прадпрыемстваў. На 100 проц. і датэрмінова сяляне раёна выканалі план хлебанарыхтовак, добраахвотна ўнеслі насенне ў фонд дапамогі сем'ям воінаў Чырвонай Арміі і партызан 1500 пудоў зярна, на 112 проц. выканалі дзяржаўны план веснавой сяўбы і 2500 бясконным гаспадаркам, галоўным чынам сем'ям франтавікоў, партызан і бядняцкім гаспадаркам, аказана дапамога ў веснавой сяўбе, якім узорана 2000 і пасеяна 3000 гектараў зямлі.

Працоўнае сялянства раёна, натхнёнае гістарычнымі пабедамі роднай Чырвонай Арміі ў справе поўнага разгрома нямецка-фашысцкіх захопнікаў, самааддана працавалі і працуе на працоўным фронце і гэтым самым выказала сваю бязмежную гатоўнасць аддаць усе свае сілы на хутчэйшае аднаўленне народнай гаспадаркі, разрушанай нямецка-фашысцкімі захопнікамі, на яшчэ большае ўмацаванне абароназдольнасці сваёй соцыялістычнай Радзімы.

Не гледзячы на тое, што нямецка-фашысцкія разбойнікі поўнасцю знішчылі прамысловасць раёна, рабочыя і совецкая інтэлігенцыя прарабілі вялікую работу па аднаўленню прамысловых прадпрыемстваў і ўжо ў першым квартале 1945 года прадпрыемствы раёна выпусцілі прамысловай прадукцыі ў цэнах 26-27 г. г. на 1 мільён 672 тысячы рублёў, што складае 106,9 проц. плана. Развіваецца стаханаўскі рух: на прадпрыемствах раёна налічваюцца сотні стаханаўцаў, сістэматычна перавыконваючых вытворчы план. Нікалайчык Даніл Іванавіч ральеўшчык БОВСУ сістэматычна выконвае вытворчае заданне на 250-300 проц. Коцік Юстын лесаруб, Орабей Міхаіл Герасімавіч пільшчык, Букшта Міхаіл Івановіч грузчык вытворчы план сістэматычна выконваюць на 115-200 проц. Лаўрэнчык Антон Іванавіч—столяр спіртзавода, Гусеў Іван Іванавіч. Гардзейка Пракоп-чорнарабочы сістэматычна выконваюць вытворчы план на 130 проц.

Поруч з вялікай праробленай работай па аднаўленню раённай прамысловасці ў раёне ёсць яшчэ вялікія недахопы ў справе аднаўлення народнай гаспадаркі. Не ўсе яшчэ прадпрыемствы выконваюць вытворчы план, асабліва Косаўскі леспрамгаз, дзе дырэктар тав. Міхалаў, які выканаў план першага квартала 1945 г. усяго на 89 проц., і ў другім квартале справа не палепшылася.

Нездавальняючы працуе райпромкамбінат, дзе дырэктар тав. Саменка, які знізіў тэмп работы ў другім квартале супроць першага квартала і, асабліва, адстае па аднаўленню прадпрыемстваў па выпуску будматарыялаў.

У многіх сельскіх советах зусім нездавальняючы ідзе пабудова і аднаўленне жылых дамоў працоўных сялян, якія пацярпелі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Асабліва адстае з гэтай справай Грыўдзінскі сельсовет—старшыня Выканкома сельсовета тав. Крокас, Яблонскі сельсовет—старшыня тав. Барсук і Гошчаўскі сельсовет—старшыня тав. Бандарык.

Задача кіраўнікоў прадпрыемстваў і арцелей раёна, задачы выканкомаў сельскіх советаў, партыйна комсамольскіх і профсаюзных арганізацый заключаецца ў тым, каб у бліжэйшыя дні знішчыць буйнейшыя недахопы ў справе арганізацыі будаўніцтва, арганізаваць на прадпрыемствах і населеных пунктах масавае соцыялістычнае спаборніцтва і падняць усе сілы працоўных на ўспешнае выкананне вытворчага плана, на аднаўленне народнай гаспадаркі, на ўспешнае выкананне чарговых сельска-гаспадарчых работ у раёне.

Выканаць і перавыканаць вытворчы план другога квартала па ўсіх паказчыках, прыняць усе неабходныя меры да датэрміновага выканання плана лесанарыхтовак і лесавывазак. У гэтай справе павінны адыграць рашаючую ролю выканкомы сельскіх советаў. якія абавязаны на аснове шырокай масава-палітычнай работы падняць ся-

(Працяг на 2-й старонцы).

лянства на выкананне гэтых задач. Усё працаздольнае жывое цягло пераключыць на вывазку леса 3 тым, каб гэта важнейшае дзяржаўнае заданне выканаць да 3-га ліпеня 1945.

У бліжэйшыя дні закончыць ворыва папараў, праполку зернавых і тэхнічных культур і разгарнуць масавую ўборку сена з тым, каб сенакашэнне закончыць да пачатка ўборкі ўраджая і арганізавана прыступіць да ўборкі ўраджая, узмацніць будаўніцтва жылых дамоў і іншых пабудоў.

Лепшай сустрэчай 3 ліпеня-дня ўсенароднага нацыянальнага свята Совецкай Беларусі будзе з'яўляцца ўспешнае выкананне сельскагаспадарчых работ і выкананне абавязкаў перад дзяржавай па мясу, малаку і яйцапастаўкам і грошавым плацяжам.

Працоўныя раёна зробяць усё магчымае, каб хутчэй залячыць цяжкія раны, нанесеныя ворагам на роднай гаспадарцы і дабіцца таго, каб Косаўскі раён да канца бягучага года вышаў у лік перадавых раёнаў у вобласці па ўсіх паказчыках работы.

Сакратар РК КП(б)Б
МАРКУШЫН

## УЗМАЦНІЦЬ ТЭМПЫ РАБОТЫ

Задача работнікаў мясцовай прамысловасці бесперапынна клапаціцца аб патрабаваннях працоўных.

Зараз, калі вайна з нямецка-фашысцкімі захопнікамі скончылася нашай поўнай перамогай і наступіў перыяд мірнага будаўніцтва, магчымасці для задавальнення пужд працоўных значна пашырыліся.

У нашым раёне ў сучасны момант адчуваецца вялікая патрэбнасць у будаўнічых матэрыялах; цэгла, чарапіца і інш., а таксама ў прадметах хатняга ўжывання.

У нашым раёне маюцца два цагельныя заводы, якія па плану павінны даваць 40 тысяч штук цэглы ў месяц.

Пры нармальнай рабоце заводаў, мы змаглі-б у некаторай ступені задаволіць патрабаванні насельніцтва. Але нашы цагельныя заводы па-сапраўднаму яшчэ не разгарнулі сваю работу.

Івацэвіцкі цагельны завод (дырэктар т. Зайцаў) за 5 месяцаў 1945 г. вырабіў толькі 28 тыс. штук цэглы. У маі вырабіў 7500 штук цэглы-сырца, гэта значыць выканаў план на 30 проц.

Яшчэ горш абстаіць справа на Бялавіцкім цагельным заводзе. Дырэктар т. Джэйкун не праяўляе гаспадарчых клопатаў у гэтай справе. На заводзе да гэтага часу не устаноўлена гліпамялка. Рабочыя т.т. Валах І. і Каровікаў В. план работы не выконваюць. На фарміроўцы выпрацоўваюць толькі па 300-400 штук цэглы.

Такое становішча нецярпімае неабходна правіваць як гэта патрабуе наша Айчызна.

## Узнікнавенне жыцця на зямлі

Як узнікла жыццё на зямлі? Гэта пытанне ўжо даўно цікавіць людзей. Вучоныя страцілі нямала часу і працы, каб вырашыць гэтае пытанне.

Навука ўстанавіла, што жыццё на зямлі узнікла не адразу, а толькі пасля таго, як на зямлі стварыліся для гэтага спрыяючыя умовы. У далёкія часы зямля была раскалёным шарам падобным сонцу.

Жыццё на ёй існаваць не магло таму, што жыццё заўсёды звязана з асобным вяшчэствам—бялком. Без бялка няма жыцця. Бялок-вельмі складанае вяшчэства. У складзе бялка заўсёды маецца вуглярод, вадарод, кісларод, азот. Бялок уваходзіць у склад рознай расліны і жывёліны. А існаваць бялок можа толькі пры азначальнай параўнальна нізкай тэмпературы. Калі тэмпература высокая, бялок згарае, распадаецца на свае састаўныя часткі-больш простыя вяшчэства. Такім чынам, бялок мог узнікнуць толькі пры параўнальна невысокай тэмпературы.

На зямлі не адразу склаліся спрыяючыя ўмовы для стварэння бялка і зараджэння жыцця.

Прайшлі сотні мільёнаў гадоў пасля узнікнавення зямлі, калі зямля астыла і перастала быць раскалёным шарам. Спачатку на зямлі былі толькі неарганічныя вяшчэствы, з іх пачалі стварацца прасцейшыя арганічныя вяшчэствы—вуглевадароды, потым усё больш складаныя. набліжаючыяся па свайму складу да бялка і, нарэшце, з явіліся на зямлі першыя камочкі бялка, а разам з імі і першыя пачаткі жыцця.

А калі жыццё з'явілася, загінуць яно ўжо не магло, таму што жыццё авалодвае неабмежаванай здольнасцю да размнажэння і прыстасаванасцю да акаляючых умоў.

Навука ведае вялікую колькасць драбнейшых і проста пабудаваных жывёлін і раслін. Карыстаючыся мікраскопам, можна бачыць у кроплі вады мільёны жывых істот—амёб, інфузорый, бактэрый. Целы іх прадстаўляюць слізістыя жывой камочак, унутры якога знаходзіцца асобнае цельца-ядро. Усе гэтыя драбнейшыя жывыя арганізмы, у параўнанні з першымі камочкамі бялка, прадстаўляюць сабой больш складаныя тварэнні, развіўшыяся з пярвічнага бялка. На працягу сотняў мільёнаў гадоў, у выніку далейшага развіцця, змянення і натуральнага адбора, з першапачатковых жывых арганізмаў узніклі ў канцы канцоў усялякія віды раслін і жывёлін, якія насяляюць зямлю.

На зямлі захаваліся шматлікія пасведчанні паступовага развіцця жывых стот. У розных частках сушы вучоныя выбіралі раскопкі зямлі і па акамянеўшым рэшткам жывёл і раслін вылічвалі прыблізна час узнікнавення розных жывых істот, якія насялялі ў свой час зямлю.

Упяршыню Чарльз Дарвін навукова даказаў, што усе расліны і жывёлы стварыліся ў выніку развіцця больш проста пабудаваных жывых істот. Ён даказаў, што і зараз працягваецца змяненне жывых істот, далейшае іх саваршэнстванне, ускладненне іх пабудовы.

Такім чынам, першыя жывыя істоты ўзнікді на зямлі у перыяд, калі пачыналася астыванне зямлі. Гэтыя жывыя істоты былі вельмі проста пабудаваны. Усе існуючыя на зямлі расліны і жывёлы стварыліся ў выніку змяненняў і паступовага ўскладнення гэтых простых жывых істот.

(перадрукавана з „Календаря калгасніка.“)

# ЗА ГРАНІЦАЙ

## Комсамольска-маладзёжны мітынг

17 чэрвеня прайшоў мітынг комсамольцаў і моладзі нашага раёна, прысвечаны ўзнагароджанню комсамола вышэйшай урадавай узнагародай ОРДЭНАМ ЛЕНІНА.

Мітынг адкрыла сакратар Райкома ЛКСМБ тов Коршунава. Прывітаў нас словамі прапастаўл енца сакратару РК КП(б)Б тав. Юшкевічу.

,,Наша моладзь, гаворыць ён, гераічна змагалася у дні Айчыннай вайны за гонар і незалежнасць нашай Радзімы. Ніколі наш народ не забудзе імён комсамольцаў-герояў Нікалая Гастэло, Зоі Космадземьянскай, Лізы Чайкінай, Віктара Талаліхіна і дзесяткі другіх маладых патрыётаў нашай Радзімы.

Комсамольцы і моладзь нашага раёна ў час вялікай Айчыннай вайны гераічна змагаліся ў партызанах.

Сотні нашых комсамольцаў узнагароджаны ўрадам за баявыя заслугі. У сучасны момант комсамольцы і моладзь самаадданна працуюць на сваіх пастах: на палёх, на вытворчасці і інш. Вялікая ўзнагарода дана комсамолу. Працаваць яшчэ лепш — вось наш адказ''.

З прывітальным словам выступаў сакратар РК ЛКСМБ тав. Савін. ,,Высокая ўзнагарода,—гаворыць т. Савін,- палкам заслужана комсамольцамі. Комсамольцы гераічна змагаліся на франтах, самаадддана працавалі ў тылу. Якое выдатнае племя вырасла пад кіраўніцтвам нашай партыі. Гэта ўзнагарода заве моладзь да новых подвігаў на славу Радзімы!.

Вялікаму Сталіну—комсамольскае ,,ура!''

І з краю ў край перадаецца грамавое ,,ура,'' падхопленае сотнямі галасоў.

Затым выступалі сакратары пярвічных комсамольскіх арганізацый і лепшыя работнікі: Саўчук Надзежда, Лось Елена, Смірнова Таісья. Мітынг прывіталі юныя піонеры Івацэвіцкай школы.

Комсамольцы і моладзь узялі на сябе абавязкі памагчы ўсе сілы на аднаўленне нашай гаспадаркі. Мітынг прайшоў ажыўлена і радасна.

Сакратар РК ЛКСМБ Коршунава

## ЛІКВІДАЦЫЯ ПОЛЬСКА-ФАШЫСЦКАЙ БАНДЫ, УЧЫНІЎШАЙ ЗВЕРСКУЮ РАСПРАВУ НАД ЖЫХАРАМІ ВЁСКІ ВЕРХАВІНЫ

ВАРШАВА, 17 чэрвеня. (ТАСС). Агенцтва Польпрэс перадала паведамленне, зробленае па матэрыялах, паступіўшых з міністэрства грамадскай бяспекі, аб ліквідацыі тэрарыстычнай банды Станіслава Сокала з «народовы силы збройне»:

«Тэрарыстычная банда Сокала налічвала звыш 200 бандытаў, узброеных пераважна аўтаматычнай зброяй. Выступаючы актыўна з сакавіка 1945 года, банда зрабіла рад нападаў на пасты грамадзянскай міліцыі і забойстваў міліцыянераў. Банда забівала таксама членаў дэмакратычных партый. 6 чэрвеня банда зрабіла напад на вёску Верхавіны, дзе па-зверску знішчыла 194 чалавекі, у тым ліку 64 дзяцей.

Для ліквідацыі банды была накіравана аператыўная група, якая 11 чэрвеня поўнасцю ліквідавала банду. Забіта 166 бандытаў, у тым ліку іх главар Станіслаў Сокал і яго памочнік «капітан Шары». Узят жывымі 41 бандыт. Захоплена зброя, у тым ліку пяць цяжкіх і пяць ручных кулямётаў».

## Смяротныя прыгаворы здраднікам у Італіі

РЫМ, 17 чэрвеня. (ТАСС), Рымскае радыё паведамляе, што ваенны трыбунал Венецыі вынес смяротныя прыгаворы палкоўніку фашысцкай арміі Мусаліні—Эдуарду Басі, вінаватаму ў здрадніцтве інтарэсам радзімы, а таксама гестапаўскаму шпіёну Карло Апрыле, па даносах якога было расстраляна многа італьянскіх патрыётаў. Ваенны трыбунал Павіі і Крэманы вынес смяротны прыгавор фашысту Мадзі, выяўленаму ў здрадніцтве і зверскіх здзеках над партызанамі.

## Англійская газета аб месца знаходжанні Гітлера

Лондан, 15 чэрвеня. Газета ,,Дэйлі Мейл'' перадае паведамленне свайго каірскага карэспандэнта аб тым, што Гітлер знаходзіцца ў Эйрэ. Згодна паведамлення, Гітлер, пераапрануты ў жаночае адзенне, высадзіўся ў Дубліне.

## АНГЛІЙСКІЯ ВОЙСКІ ЗАХАПІЛІ РЫБЕНТРОПА

Лондан, 15 чэрвеня. Як перадае карэспандэнт агенства Рэйтэр, які знаходзіцца пры 21 армейскай групе, у англійскай акупацыйнай зоне ў Германіі захоплен былы Германскі міністр замежных спраў Рыбентроп.

Рыбентроп быў захоплен у ложку англійскім лейценантам у Гамбургу.

У яго знайшлі тры пісьма: адно да Чэрчыля, другое да англійскага міністра замежных спраў Ідэна і трэцце фельдмаршалу Монтгомеры. У Рыбентропа знайшлі таксама банку з атрутцем.

Рыбентроп прыбыў у Гамбург 30 красавіка, дзе ён меў надзею захавацца ў аднаго гандляра віном, якога ён ведаў на працягу 25 год, але апошні адмовіўся прадаставіць яму убежышча. Рыбентроп пасяліўся ў прыватным пансіоне пад прозвішчам Рэзе. Рыбентропу было загадвана апранупца і ён быў дастаўлен у штаб саюзнікаў у Гамбурзе, дзе яму зрабілі медыцынскі агляд. Рыбентроп сам перадаў банку з атрутцем, якую ён трымаў пры сабе.

Асобу Рыбентропа падцвердзілі яго сястра, захопленая у палон раней, і гандляр віном, які адмовіўся даць яму ўбежышча.

Ч. в. а Адказны рэдактар **Папова**

## АБ'ЯВА

Супругі Остапчык Іван Александравіч і Остапчык Елізавета Іванаўвна, пражываюшчыя ў г. Косаве ўзбуджаюць справу аб разводзе. Справа падлягае разгледжанню ў Нарсудзе Косаўскага раёна.

Нарсуд Косаўскага раёна.

Г Л 15272 Адрас рэдакцыі; гарадскі пасёлак Івацэвічы, вул. Шасейная, дом № 11.